А. Г. Кірылушкін У. А. Мінееў

# ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ: ЖЫЦЁВЫ ШЛЯХ І ДЗЕЙНАСЦЬ

*Даклад прысвечаны характарыстцы жыцця і дзейнасці Вацлава Ластоўскага, беларускага грамадскага і палітычнага дзеяча, пісьменніка, гісторыка, філолага, літаратуразнаўца, этнографа, акадэміка Беларускай акадэміі навук*

У самым пачатку XX ст. на беларускім літаратурным небасхіле ўзышла новая яркая зорка – Вацлаў Ластоўскі. На працягу амаль чвэрці стагоддзя імя яго не сыходзіла са старонак перыядычнага друку. У больш чым 300 публікацыях В. Ластоўскі паўставаў як выдатны пісьменнік, крытык, публіцыст, гісторык, мовазнаўца. Пазней ён выявіў сябе як паэт, філолаг, этнограф, выдавец, перакладчык, бібліёграф. У гісторыі Беларусі В. Ластоўскі застаўся і як актыўны грамадскі і дзяржаўны дзеяч. Ён з'яўляўся прэм'ер-міністрам (1919-1923 гг.) абвешчанай у 1918 г. Беларускай Народнай Рэспубліцы, быў адным з першых дырэктараў Беларускага дзяржаўнага музея, правадзейным членам Інстытута Беларускай Культуры (1927 г.) і адным з першых акадэмікаў Беларускай акадэміі навук (1928 г.), працаваў яе сакратаром (1928-1929 гг.).

Восенню 1883 г., 27 кастрычніка паводле старога стылю, а паводле новага – 8 лістапада, у засценку Калеснікава, на Дзісеншчыне, у сям'і Юстына і Ганны Ластоўскіх нарадзіўся сын Вацлаў. Першую навуку чытацьскладаць хлопчык лёгка адолеў дома, і бацькі аддалі сына ў бліжэйшае мястэчка Стары Пагост, дзе месціліся належныя ўстановы. У ліку іх значылася парафіяльная школа. Пасля яе заканчэння ў 1894 г. здольны падлетак спрабаваў, па няпэўных звестках, атрымаць адукацыю ў Дзісенскай павятовай вучэльні.

Юнацтва В. Ластоўскага праглядаецца пункцірна і непаслядоўна: хлопчык на паслугах у адной з віленскіх вінных крамак; канцылярыст казённай установы ў Шаўлях... Але яго вабіла навука. Юнак дабраўся да Санкт-Пецярбурга – найбуйнейшага культурнага асяродка Расійскай імперыі пачатку XX ст., дзе ўладкаваўся бібліятэкарам прыватнай студэнцкай бібліятэкі, адначасова зазіраючы ў аўдыторыі ўніверсітэта паслухаць лекцыі славутых прафесараў. Не маючы грошай, каб плаціць за ўніверсітэцкую адукацыю, на лекцыі наведваўся «зайцам» (1904-1905 гг.). Пэўнымі застаюцца два факты: у 1902 г. юнак стаў членам Польскай сацыялістычнай партыі Літвы і Беларусі, а ў 1903 г. узяў шлюб з Марыяй Іваноўскай (Іванаўскайтэ, 1872-1957), пазней вядомай пад агульным са старэйшай сястрой Зосяй псеўданімам летувіскай пісьменніцай Лаздзіну Пяледай. Нейкі час маладыя жылі ў мястэчку Парагяй (поўнач Летувы). Пажыў Вацлаў і ў Рызе. Там у 1906 г. спрабаваў здаць экзамены на атэстат сталасці, аднакняўдала. Далей працягваў паглыбляць веды нястомнай самаадукацыяй. У 1906 — 1908 гг. В. Ластоўскі быў членам Беларускай сацыялістычнай грамады.

З 1902 г. В. Ластоўскі пачаў занатоўваць «цікавыя» словы. Напачатку запісваў іх для сябе самога, бо вельмі ж «асабіста цікава было слова само па сабе». У сакавіку 1909 г. В. Ластоўскі прыехаў у Вільню, куды быў запрошаны на пасаду сакратара рэдакцыі «Нашай Нівы», на старонках якой выйшла і першая публікацыя В. Ластоўскага пад псеўданімам «Власт». 19 лістапада 1909 г. «Наша Ніва» надрукавала яго апавяданне-абразок «Нарадзіны», а ў наступным, 48-м нумары апавяданне «Зайчык». «Зайчык» стаў не толькі дэбютам В. Ластоўскага-празаіка, але і адным з пачаткаў беларускай дзіцячай літаратуры XX ст. Маленькаму чытачу пазней будуць прысвечаны асобныя казкі пісьменніка «Князь Барыс і чорт», «Дзед і ўнук», «Певень і гуся», «Вуж куртаты і мужык багаты» і цэлыя чытанкі, складзеныя ім падчас кіраўніцтва Беларускім выдавецкім таварыствам у Вільні (Knižyca dla biełaruskich dzietak dziela nawuki čytannia; Rodnyje Ziarniaty: knižyca dla škоlnaha čytannia; абедзве Вільня, 1916). Рост Власта ішоў шпарка. 1 студзеня 1910 г. сваім навагоднім нумарам «Наша Ніва» распачала друкаваць яго «Кароткую гісторыю Беларусі», з выхадам якой беларуская літаратура нашаніўскай пары набыла надзейныя арыенціры, каб упэўнена крочыць у будучыню.

У ліпені 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна. Недзе ў гэты час драматычныя змены адбыліся і ў асабістым лёсе В. Ластоўскага: фактычна распаўся шлюб Вацлава і Марыі. Хоць бацькоўскі абавязак і чулае сэрца па-ранейшаму прыводзілі Вацлава да дзвюх мілых шчабятух – Ганкі і малодшанькай Стаські.

А пакуль у «Нашай Ніве» рэй вёў новы рэдактар І. Луцэвіч (Я. Купала). В. Ластоўскі ж становіцца фактычным уладальнікам «Беларускай кнігарні», кантралюючы выданне школьных падручнікаў і чытанак. Ды ён не толькі кантраляваў, але і сам удзельнічаў у іх стварэнні: склаў «кніжку для школьнага чытання» «Родныя зярняты», «першую пасля лемантара чытанку» «Незабудка». Знаходзячыся ў эміграцыі ў 1920-1923 гг. В. Ластоўскі наведаў з дыпламатычнымі місіямі Бельгію, Германію, Ватыкан, Італію, Чэхаславакію, Францыю, Швейцарыю. На кожнай урачыстай аўдыенцыі, міжнароднай канферэнцыі, палітычнай нарадзе ён

выступаў як беларус, ад імя Беларусі і дзеля будучыні Беларусі. Пакінуўшы ў 1923 г. пост прэм'ер-міністра БНР В. Ластоўскі ўзяўся за выданне «месячніка літаратуры, культуры і грамадскага жыцця» пад назвай «Крывіч». У Коўне ён выдаў капітальны фаліянт «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» (1926), з якім прыехаў у Менск на Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу. Тут канчаткова выспеў намер пераехаць у БССР, што ён і ажыццявіз ў сакавіку 1927 г. У Менску В. Ластоўскаму прапанавалі пасаду дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея і загадчыка кафедры этнаграфіі пры Інстытуце беларускай культуры. Вучоны арганізаваў пошукавыя экспедыцыі. Падчас адной з іх, у Полацак, быў выратавны крыж Еўфрасінні Полацкай. У сталым узросце В. Ластоўскі апроч іпастасі паэта і перакладчыка раскрыўся і як мемуарыст. Ягоныя каларытныя ўспаміны пра маленства і вучобу ярка малююць воблік беларускага мястэчка канца XIX ст., уваскрашаюць шматлікія звычаі, абрады, якія цяпер не захаваліся («Старабеларуская вясковая школа», 1923; «Успаміны з нядаўняй мінуўшчыны», 1925). Незабыўныя згадкі пра Я. Купалу і М. Багдановіча ўзнаўлялі легендарную атмасферу, напоўненую духам пазітывізму, у якой працаваў калектыў «Нашай Нівы». 21 ліпеня 1930 г. В. Ластоўскі быў арыштаваны ДПУ БССР па справе «Саюза вызвалення Беларусі». Пастановай Калегіі АДПУ СССР ад 10 красавіка 1931 г. высланы на 5 гадоў у Саратаў. Працаваў загадчыкам аддзела рэдкіх рукапісаў біблітятэкі Саратаўскага ўніверсітэта. Паўторна арыштаваны 20 жніўня 1937 г. упраўленнем НКУС Саратаўскай вобласці, В. Ластоўскі, праз 5 месяцаў катаванняў, 23 студзеня 1938 г. як «агент польскай разведкі і ўдзельнік нацыянал-фашысцкай арганізацыі» рашэннем Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання. 23 студзеня 1938 г. прысуд прывялі да выканання ў Саратаве. Па першым прысудзе рэабілітаваны 10 чэрвеня 1988; па другім — 16 верасня 1958. Адноўлены ў званні акадэміка АНБ у 1990.

### *Список литературы*


1. Янушкевіч, Я. Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі / Я. Янушкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 68 с.; іл.
2. Некрашэвіч, С. [Рэцэнзія] / С. Некрашэвіч // Асвета. – 1926. – № 5. – С. 168. Рэц. на кн.: Ластоўскі, В.Ю. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі: спроба паясніцельнай кнігапісі ад канца X да пачатку XIX стагодзьдзя / В. Ю. Ластоўскі. – Коўна: Друк. Сакалоўскага і Лана, 1926. – 776 с.
3. Власт (Ластоўскі, В. Ю.). Кароткая гісторыя Беларусі [1129 –1905 гг.]: З 40 рыс. / Власт; Аўт. пасляcл. А. Грыцкевіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 126 с.:іл. – Факс. выд.: Вільня: Друкарня Марціна Кухты, 1910.
4. Барысенка, В. У. Творчасць В. Ластоўскага ў ідэйна –мастацкім кантэксце беларускай літаратуры пачатку XX ст. : аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені канд. філал. навук : 10.01.01/ В.У. Барысенка; БДУ. – Мінск, 2000. – 21 с.


–


*Кірылушкін Аляксандр Генадзевіч,* студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР, Aleksandrkirilushkin@gmail.com
*Мінееў Уладіслаў Аляксандравіч,* студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР, vladislav.mineev.07@mail.ru
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна,* загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін БДУІР, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by